# Ці трэба змяняць выбарчую сістэму Беларусі?

«Звязда» № 32 от 17 февраля 2012 года

**Калі вы ідзяце на выбары (няважна, рэспубліканскія ці мясцовыя), якім чынам вы вырашаеце, за каго аддаць свой бясцэнны (для некага з кандыдатаў, магчыма, пераможны) голас? Вам важныя асабістыя характарыстыкі кандыдата ці яго праграма і заклікі? Напэўна, многія ўсё ж такі скажуць, што для іх найважней ведаць будучага дэпутата як чалавека. Наўрад ці шмат хто ўражваецца толькі прыгожымі заклікамі і прамовамі. Сёння ў Беларусі на выбарах выкарыстоўваецца мажарытарная сістэма, таму галасуюць выключна за асоб, а не за партыі, і прымушаюць пераможцу набіраць хоць бы на адзін голас больш, чым яго канкурэнт. Пра існаванне партый беларусы трошкі прызабылі. Мінуў перыяд улады КПСС — і вяртацца да яго ніхто не хоча. А, напрыклад, у Аўстрыі, Расіі, Італіі, Бельгіі, Фінляндыі і іншых краінах выкарыстоўваецца прапарцыянальная выбарчая сістэма, дзе галасуюць па партыйных спісах — іншымі словамі, за партыю, а не пэўную асобу.**

Апошнім часам і ў Беларусі пачалі абмяркоўваць неабходнасць актывізаваць працу партый. Хтосьці выказваецца за тое, што гэта не патрэбна. Хтосьці — што прапарцыянальная сістэма дазволіць сфарміраваць сістэмную парламенцкую апазіцыю, што будзе станоўчай з'явай. Многія прытрымліваюцца думкі, што трэба захаваць элементы адной сістэмы і ўвесці яшчэ новыя з другой — каб атрымаць змешаную сістэму. Але размовы размовамі, а калі што давядзецца змяняць і Канстытуцыю, і Выбарчы кодэкс. Неабходна будзе ўвогуле ствараць новае прававое поле. Хто ведае, магчыма, і змены ў колькасці дэпутатаў парламента патрэбны будуць. Адным словам, хуткіх рэформаў не атрымаецца. Дык ці патрэбна іх распачынаць? "Звязда" прапануе чытачам некалькі меркаванняў на гэты конт.



**Мікалай Лазавік, сакратар Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў:**

— Я заўзяты прыхільнік мажарытарнай сістэмы. Прычым я яе і тэарэтычна вывучыў, і выпрабаваў на асабістым вопыце, калі абіраўся дэпутатам раённага Савета, абласнога Савета, Вярхоўнага Савета. Хацеў бы адзначыць, што дэмакратычнасць выбарчага працэсу не залежыць ад таго, мажарытарная ці прапарцыянальная сістэма. І тая, і другая вельмі шырока выкарыстоўваюцца ў свеце і маюць права на існаванне. Але я вылучаю мажарытарную як больш набліжаную да выбаршчыкаў. На мой погляд, пры ёй на першы план ставіцца галоўны суб'ект выбарчага працэсу — выбаршчык. Не партыя, не дэпутат, а менавіта выбаршчык. Пры гэтай сістэме любы выбаршчык пры жаданні, падкрэсліваю, можа пазнаёміцца з тымі кандыдатамі, якія балатуюцца па ягонай акрузе. Можа даведацца, чаго яны дасягнулі ў сваёй працы, у грамадскім жыцці, як яны зарэкамендавалі сябе ў сваёй сям'і, як яны выхоўваюць сваіх дзяцей. Кожны мае права прыйсці на перадвыбарную сустрэчу і асабіста пазнаёміцца з кандыдатам, задаць яму пытанне, штосьці параіць. Іншымі словамі, пры мажарытарнай сістэме выбаршчык робіць усвядомлены выбар. Больш за тое, дэпутат абавязаны перыядычна даваць справаздачу перад

сваімі выбаршчыкамі. І таму пры выбарах па мажарытарнай сістэме кожны кандыдат імкнецца заваяваць давер выбаршчыкаў, даказаць сваю адданасць менавіта ім.

Адваротны ж бок медаля ў тым, што пры такой сістэме вельмі ўскладнена магчымасць праходу ў выбарчы орган прадстаўнікоў меншасці, апазіцыі. Трэба быць вельмі харызматычнай асобай, выдатным чалавекам, каб за цябе прагаласавала большасць выбаршчыкаў. Гэта асноўны недахоп, таму што, я лічу, што апазіцыя ў парламенце павінна быць, а таксама ў рэгіянальным Савеце, абласным. Няхай яны лепш сутыкаюцца сваімі інтарэсамі на пасяджэннях сесій, чым дзесьці на вуліцах і плошчах. Але калі разабрацца, то пры прапарцыянальнай сістэме выбаршчык галасуе не за канкрэтную асобу, а за спіс палітычнай партыі. Некаторыя прыхільнікі гэтай сістэмы кажуць, што выбаршчык будзе галасаваць за тую партыю, у якой найлепшая праграма. Ды лухта гэта ўсё. Вазьміце праграмы ўсіх партый (і апазіцыйных, і праўрадавых) — і ў адных, і ў другіх будзе ў праграме запісана: "Мы за шчасце народа! За светлую будучыню!". Рознымі словамі, але адно і тое ж практычна. І простаму выбаршчыку разабрацца ў гэтым вельмі цяжка. Таму нават пры прапарцыянальнай сістэме ён галасуе не за палітычную праграму, а зноў такі за таго лідара, які ўзначальвае гэту партыю. Напрыклад, у Расіі галасуюць не за праграмы, якія напісалі Жырыноўскі ці Зюганаў, а за канкрэтнага палітыка і тых, каго ён цягне за сабою. Але ў гэтым выпадку ўжо вылучаецца на першы план не выбаршчык, не яго асэнсаваны выбар, а выбар кіраўніка партыі — каго ён уключыў у спіс. Нельга не прызнаць, што пры прапарцыянальнай сістэме склад выбарнага прадстаўнічага органа больш адэкватна адлюстроўвае сацыяльна-палітычны склад грамадства. Напрыклад, у Беларусі жанчын больш, чым мужчын — вось і ў парламенце іх павінна быць больш. Ёсць там, напрыклад, працэнтаў дзесяць апазіцыянераў — няхай у парламенце іх будзе столькі ж. Прапарцыянальная сістэма дае шанц гэтым палітычным партыям, якія не карыстаюцца падтрымкай большасці, але адлюстроўваюць інтарэсы і погляды пэўных пластоў насельніцтва.

Дадам яшчэ, што і змешаная сістэма таксама не выйсце. Ёсць прыклады, калі з-за яе ў парламент траплялі бяздарнасці, якія не прайшлі па акрузе, але прабіліся праз партыйныя спісы.

**Валянціна Лявоненка, дэпутат Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах і сувязях з СНД, член КПБ:**



— Зараз у нас мажарытарная сістэма. Яна персаніфікуе палітыку і патрабуе пэўных характарыстык асобы ў палітыцы. Гэтая сістэма менш за ўсё накіравана на актыўную дзейнасць палітычных партый. На маю думку, выбарчая сістэма павінна даваць магчымасць розным пластам насельніцтва выказваць свае інтарэсы праз сваіх прадстаўнікоў — партыі. Аднак мажарытарная сістэма найбольш адэкватная менталітэту беларусаў. Бо калі паразважаць, то гістарычна славяне заўсёды вельмі вялікую ўвагу надавалі таму, хто імі кіруе. Сёння, вядома, працэсы, якія адбываюцца ў свеце, прыводзяць да таго, што палітычная сістэма павінна быць адкрытая для

інавацый. І калі ўжо палітычныя партыі артыкулююць інтарэсы і думкі грамадзян, то гэтыя партыі патрабуюць для сябе большага месца ў палітычнай сістэме. Толькі не трэба рабіць рэзкага пераходу ад мажарытарнай да прапарцыянальнай сістэмы. *Думаю, што мэтазгодна ісці па шляху змешанай, мажарытарна-прапарцыянальнай.* Яна дазволіць, не ламаючы праз калена традыцыйна складзеныя спосабы фарміравання прадстаўнічага органа ўлады, укараняць паступова і новыя формы і магчымасці. У такім сінтэзе мы можам прыйсці да якога-небудзь канкрэтнага тыпу выбарчай сістэмы і паглядзім, што будзе больш карысна для грамадства.

Але, безумоўна, ніякая выбарчая сістэма не зможа замяніць асобу ў гісторыі і палітыцы. Яна не можа падмяніць палітычную партыю ў дзейнасці, калі патрэбна заслугоўваць аўтарытэт сярод насельніцтва. Ад саміх лідараў партый таксама шмат што залежыць. Якія ў іх свежыя ідэі? Наколькі яны харызматычныя, неардынарныя? Людзі зараз хочуць, каб палітыкі жылі сярод людзей, інтарэсамі людзей. Каб не было ніякай сцяны, якая адгароджвае палітычныя партыі і грамадзян. Народ хоча, каб іх праблемы вырашылі, а не "загаварылі". І зараз перад палітычнымі партыямі будзе паўставаць пытанне: "А што вы можаце прапанаваць людзям?"



**Аляксандр Шацько, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе, намеснік старшыні прэзідыума РГА "Белая Русь":**

— Ідэя добрая (змяніць выбарчую сістэму. — **Аўт.**). Ідэя сусветнага фармату. Адзінае: я думаю, што для Беларусі было б няправільна змяняць сістэму выбараў выключна на прапарцыянальную. Павінны быць і палітычныя партыі, і самавылучэнцы.*Найбольш*, на маю думку, *прымальны для нашай краіны варыянт — гэта змешаная сістэма.* Для нашага менталітэту ўсё ж такі больш важны і больш важкі чалавек, а не нейкая абстрактная партыя. А змешаная сістэма дасць і адно, і другое. Разумееце, ідэальнай выбарчай сістэмы няма нават у тэорыі. Ніводная сістэма ніколі не дасць бездакорную чысціню выбараў. Палітыка — гэта вялікая, глабальная гульня. Калі краіна добра развіваецца, то большасці людзей усё роўна, хто стаіць каля ўлады і якімі гульнямі займаецца.

Зразумела, што мне як члену "Белай Русі" больш цікава было б працаваць у партыі, чым у грамадскім аб'яднанні. Хоць у нас і так даволі сур'ёзны фармат. Проста мы не праводзім нейкіх шумных акцый, не займаемся глабальным піярам, але гэта няправільна. У складзе нашай арганізацыі больш за 120 тысяч чалавек. І, думаю, калі мы станем партыяй, удзельнікаў стане яшчэ больш. Тут нават справа не ў адміністрацыйным рэсурсе. Людзям хочацца быць нейкай сацыяльнай фармацыяй. Але, напрыклад, маё членства ў "Белай Русі" не адыграла ніякай ролі ў акрузе, дзе я балатаваўся. Усё ж такі выбары больш ішлі па тым, што з сябе ўяўляў я. Але гэта пакуль. Сітуацыя, думаю, зменіцца.

Галоўны плюс рэфармавання сістэмы ў тым, што гэта паспрыяе развіццю грамадзянскай супольнасці. Не маючы апошнім часам ніякіх палітычных калізій, рэформаў, мы трошкі расслабіліся і не ведаем увогуле, што такое палітыка. У людзей неабходна выхаваць новую палітычную культуру. Не трэба ніякага пералому. Паступова створым глебу. Трэба ж яшчэ адзін вельмі вялікі страх пераадолець, калі адбудзецца пераход у фармат палітычнай партыі: якую б мы партыю ні стварылі, яна будзе ўсё роўна мець выгляд былой камуністычнай, таму што ніхто не прыдумаў лепшага стрыжня, структуры. Гэта людзей вельмі пужае. Аднак не трэба гэтага баяцца.




Станаўленне ж новай палітычнай сістэмы можа заняць 5-6 гадоў. Але зрухі вельмі патрэбны. Мы ж жывём у свеце, не пад каўпаком. Свет змяняецца, і мы павінны ўзяць усё самае перадавое, бо мы стаім яшчэ ў самым-самым пачатку. А руху ж наперад, развіцця без канкурэнцыі не можа быць.

Яшчэ адзін аргумент на карысць стымулявання партыйнай актыўнасці — палітыкі павінны быць прафесійнымі. Частая змена парламента, пастаянны прыход новых людзей — гэта не зусім правільна. Моладзь, вядома, павінна быць. Але для эфектыўнай працы парламента патрэбны дасведчаныя, мудрыя людзі. На жаль, мудрасць у 25 гадоў яшчэ не прыходзіць.

**Асабістая думка**

Відаць, што кожны з нашых субяседнікаў мае рацыю. Я згодны з тым, што мажарытарныя выбары выводзяць на першае месца выбаршчыка, чаго не могуць зрабіць іншыя сістэмы. Аднак аргументацыя пазіцыі за змешаную сістэму мне таксама зразумела. І я больш схіляюся да неабходнасці развіцця палітычных партый. Тым больш, як сказала Валянціна Лявоненка, пры наяўнасці партый ніхто ніколі не адменіць ролі асобы. Харызма патрэбна і партыйнаму лідару. Адно толькі трошкі насцярожвае: магчымасць таго, што партыйныя дэпутаты будуць прасоўваць інтарэсы не выбаршчыкаў, а саміх партый. А каб гэтага не было, выбаршчыкам проста трэба будзе стаць вельмі ўважлівымі і аналізаваць кожнае слова кандыдата, кожны ягоны заклік, сачыць за палітычным жыццём краіны больш глыбока, чым зараз, бо ўсё роўна і за партыйнай праграмай таксама людзі стаяць.